# Ідзі за сваёй марай

Сёння ў салоне, у якім можна набыць новае жыццё, вельмі многа людзей. Пакупнікі перагаворваюцца, спрачаюцца, прымяраюць, здзіўляюцца, уздыхаюць.

На цэнтральных паліцах у стракатых вокладках ляжаць жыцці палітыкаў, прадпрымальнікаў. Яны пераліваюцца, блішчаць. Нямногія могуць дазволіць сабе – каштуюць вельмі дорага.

Наступная паліца – жыцці звычайныя. Тут можна ўбачыць настаўніка, урача, вадзіцеля, будаўніка, бухгалтара. Іх купляюць часцей. Кошт па кішэні, догляд просты. Купіў, паклаў у шафу і праз некаторы час цябе чакае жыццё звычайнага чалавека. Ні клопатаў, ні трывог, усё проста і зразумела. А галоўнае – бяспечна.

Кожны дзень з экранаў тэлевізараў мы чуем, што бяспека – галоўнае ў жыцці! Вось людзі глядзяць, слухаюць і набываюць сабе бяспечнае жыццё.

Была і трэцяя паліца. Там размясціліся жыцці творчыя: артысты, мастакі, пісьменнікі, музыкі. Іх часта прымяраюць, але вельмі рэдка набываюць. Уся справа ў тым, што даглядаць складана. Неабходна праветрываць, берагчы ад сонца, не трымаць у цёмным месцы. Трэба набыць яшчэ і цярпенне, каб штосьці атрымалася.

Кансультант пазяхаў, чакаў заканчэння працоўнага дня. Дзверы ў краму адчыніліся, на парозе стаяў малады хлопец. Кансультант пазнаў яго. Малады чалавек часта заходзіць і доўга глядзіць на жыццё мастака, але ніколі не набывае. Кансультант за гады працы навучыўся разумець пакупнікоў без слоў. У хлопца проста не было грошай.

Сёння ён зусім іншы: упэўнены позірк, цвёрды крок. Малады чалавек падышоў да стала, дастаў грошы і папрасіў падаць яму новае жыццё. Ён усміхаўся, у блакітных вачах танцаваў агеньчык. Кансультант усміхнуўся ў адказ. Ён разумеў, што хлопцу будзе цяжка і небяспечна, але таго, хто ідзе за сваёй марай, чакае поспех.

***Струк Віялета Барысаўна,***
вучаніца Х класа ДУА «Галавінская сярэдняя школа» Гомельскага раёна